*Сівер: Сівер* ***пілуе*** *голлі,* ***перабірае*** *сукі* [2, с. 52]; *Сівер* ***не атрос*** *узімку* [3, с. 60]; *Сівер* ***дзьмухне*** *груба,* ***сячэ*** *ў вочы сівер* [2, с. 168].

*Ручай:* ***Абагнаў*** *сяброў ручай,* ***прапаў, зашыўся*** *ў мох* [5, с. 86]; *і навізну якую* ***нясе*** *нам шчаслівы ручай* [1, с. 66].

*Сонца: Нават сонца маладзей* ***глянула*** *з блакіту* [6, с. 36]; *Сонца* ***наліло*** *фарбы ў вядзерцы…* [7, с. 69]; *Сонца кволую луску* ***не сашмаргнула*** *вострым мечам* [7, с. 127] і інш. .

*Сцяжынка: А твая сцяжынка* ***сцелецца і сцелецца, вабіць*** *у нязведаны прасцяг* [4, с. 11].

Часцей за ўсё Васіль Вітка карыстаецца тропамі з лексіка-семантычных груп «Дзеянне, працэс», «Стан», «Рух, перамяшчэнне».

*Аб'ядналь: Што ў апошні раз табе сказаць, як зямныя словы аб'яднаць, калі сам ты* ***аб'яднаўся з*** *ёй, з ёй навек, з роднаю зямлёй* [4, с. 59].

*Адарыць: Вы пацярпіце, пачакайце, дайце час, вялікай існай мудрэц* ***адорыць*** *нас* [4, с. 24];.

*Адбіць: Мы хацелі другую* ***адбіць*** *тэлеграму, што даўно не баліць раток у мамы* [5, с. 32].

*Адняць: Сунуў я руку ў дупло – і аж мову* ***адняло*** [5, с. 40].

*Браць:* ***Браў*** *я прыступам час* [4, с. 25]; ***Бяру*** *грэх на душу* [4, с. 44]; *Сінь каўказскага неба я* ***бяру*** *на ўспамін* [5, с. 212].

*Варочаць: А што не ўзяць, не ўгрызці гэты камень, вы самі ж столькі год* ***варочалі*** *яго сваімі языкамі* [4, с. 24].

*Вылузваць: Быў я зломак, не пустадомак, надзел свой* ***вылузваў,*** *адвечных пялёнак* [3, с. 223].

*Высякаць: і суіхаюць у гнязде галасы бусловыя, толькі водгулле ідзе –* ***высякаю*** *словы я, словы адмысловыя* [5, с. 37].

*Драць: Якая ж сіла іх насіла і вымушала горла* ***драць*** [4, с. 19].

*Займаць: Падняўся людзям на дабро Равель на крылах балеро і над усёй зямлёй лунае, людское сэрца падымае вышэй касмічнае ракеты, – аж дух* ***займае*** *ў планеты!* [8, с. 153].

*Знішчыць: Лес, і рэчку, і клёкат бусловы, чалавечую ўсмешку ўраз можна* ***знішчыць*** *адным толькі словам, што бяздумна вырвецца ў нас* [1, с. 222].

*Ісці: Доўга ў іх* ***ішла*** *бяседа-гаворка* [3, с. 33]; ***Ідзе*** *лад-парадак у гнязде* [5, с. 35].

*Лавіць: Усё часцей я* ***лаўлю*** *гэта слова – інтэрв'ю…* [8, с. 100].

*Ламаць: Рукі ў смутку* ***ломіць*** *маці, у адчаі і трывозе* [5, с. 51].

*Ляцець: Дагары* ***паляцелі*** *каноны, законы, за якія ніхто не хоча трымацца* [4, с. 46];

*Прадаць: Трэці… Трэці здрадцам стаў, бацьку роднага* ***прадаў*** [3, с. 233].

*Рваць: Хто ныў, хто выў, хто плакаў, было і смехаты – глядзелі разявалі і* ***рвалі*** *жываты* [2, с. 108].

*Снавацца: Нібыта на прывязі чоўнік,* ***снуюся*** *ў жыццёвых кроснах, раб твой, слуга твой, чыноўнік, якому ад страху млосна* [1, с. 158].

*Уводзіць: Не варта* ***ўводзіць*** *славечка ў моду* [2, с. 57].



*Утрымацца: Памажы мне, тэлепатыя, як дамоў дацеляпацца, на свой бераг перабрацца і за рыфму* ***ўтрымацца*** [8, с. 252].

*Хаваць: Тайну я сваю* ***хаваю****, берагу бяду сваю – аднаго даўно кахаю, пра другога думаю* [2, с. 55].

*Шнырыць: Бач, як стуліўся, нячысцік абдзёрты, думае, мусіць,* ***шнырыць*** *вачамі па хаце: ніколі не бачыла чорта* [5, с. 127].

Мова твораў Васіля Віткі мае невялікі арсенал лексіка-семантычных груп дзеяслоўных метафар, але пры дапамозе гэтага тропа паэтам ствараюцца разнастайныя мастацкія характарыстыкі аб'ектаў і з'яў рэчаіснасці, перадаюцца пачуцці чалавека, яго думкі і ўчынкі.

***Літаратура***


1. *Вітка, Васіль Бібліятэка беларускай паэзіі / В. Вітка. – Мінск: Беларусь, 1968. 168 с.*
2. *Вітка, Васіль Случчына / В. Вітка. – Мінск: Маст. літ., 1981. – 350 с.*
3. *Вітка, Васіль. Вышыні святла. Вершы. / В. Вітка.– Мінск: Маст. літ. – 1977. – 112 с.*
4. *Вітка, Васіль. Дзецям. Выбраныя творы: у 2 кн. / В. Вітка. – Кн. 1. – Мінск: Юнацтва, – 1986. – 334 с.*
5. *Вітка, Васіль. Трэція пеўні. / В. Вітка. – Мінск: Маст. літ., – 1988. – 159 с.*
6. *Вітка, Васіль. Дзецям: Выбраныя творы: у 2-х кн. / В. Вітка. – Т. 2. – Мінск: Юнацтва, 1986. – 287 с.*
7. *Вітка, Васіль. Мінскія балады. / В. Вітка. – Мінск: Юнацтва, 1982. – 55 с.*
8. *Вітка, Васіль. Паверка. / В. Вітка. – Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1961. – 374 с.*


*Л. Я. Богуш (Мінск)*

## АСАБЛІВАСЦІ СЛОВАЗМЯНЕННЯ НАЗОЎНІКАЎ МНОЖНАГА ЛІКУ Ў МОВЕ ГАЗЕТЫ «НАША НІВА»

У сучаснай беларускай мове ўпарадкаванне словазмянення назоўнікаў застаецца актуальнай навукова-практычнай задачай. Адны правілы з'яўляюцца залішне складанымі і патрабуюць спрашчэння, другія маюць неабходнасць у карэкціроўцы ў сувязі са зменамі узуальных нормаў. У ходзе нарматыўнай работы варта ўлічваць факты гісторыі мовы, бо правесці правамерныя і мэтазгодныя ўдакладненні можна толькі добра ведаючы моўныя традыцыі.

Для беларускай мовы вельмі паказальным ў плане высвятлення гістарычных заканамернасцей і тэндэнцый выступае перыяд пачатку XX ст., калі былі закладзены асновы сучаснай сістэмы мовы. У сваім даследаванні на падставе дэталёвых падлікаў у мове аўтарытэтнага выдання пачатку XX ст. – газеты «Наша Ніва» – разгледзім хроналагічныя змены ў афармленні найбольш праблемных на сённяшні дзень склонавых канчаткаў назоўнікаў множнага ліку. Для аналізу выкарыстаны матэрыялы газеты за 1910 год (№ 1 і № 52).

Назоўнікі розных родаў у «Нашай Ніве» мелі свае варыянты канчаткаў. Унутры родавых парадыгм канчаткі вар'іраваліся таксама ў залежнасці ад тыпу асновы.

1. Назоўнікі ***мужчынскага роду***.

1. 1. Канчаткі **роднага** склону.

- Пры аснове на *цвёрды* зычны выкарыстоўваліся канчаткі *-оў (-аў)*, *-эй* або нулявы. У № 1 у 97% выпадкаў фіксуецца канчатак *-оў* (незалежна ад націску): *сыноў, дактароў, вар'ятоў, у беларусоў, студэнтоў, гвалтоў, прамоўцоў, выбароў, фактоў* і інш. ; у 3% – канчатак *-эй*: *крывічэй*; слоў з нулявым канчаткам у нумары няма. У № 52 91% прыкладаў адлюстроўваюць канчатак *-оў* (незалежна ад націску): *буракоў, песьняроў, чытачоў, дамоў, палацоў, выбароў, беларусоў, вучасткоў, курсоў, карэспандэнтоў, студэнтоў* і г. д. ; 3% – канчатак *-аў*: *хлопцаў*; 6% – нулявы канчатак: *мешчан* (2 ужыванні).
- У словах з асновай на *г, к, х* стабільна фіксуецца канчатак *-оў*. У № 1 ён ужыты ў 98% адпаведных прыкладаў: *векоў, князькоў, казакоў, вяршкоў, налогаў, пастушкоў, чыноўнікоў, ворагоў* і г. д. ; у № 52 – у 96%: *грэхоў, мужыкоў, прыказчыкоў, памятнікоў, вучасткоў, батлейшчыкоў* і інш. І ў № 1, і ў № 52 зафіксавана слова *чэлавек* з нулявым канчаткам, якое з улікам колькасці ўжыванняў складае 2% у № 1 і 4% у № 52.
- Назоўнікі з асновай на *мяккі* зычны ў № 1 маюць канчатак *-ёў* у 100% выпадкаў: *рублёў, вэксэлёў, князёў, роёў, сажнёў* і г. д. У № 52 зафіксаваны канчаткі *-ёў* (76%): *рублёў, жыцелёў, рысёў*; *-яў* (12%): *лосяў*; *-ей* (12%): *коней*.

Такім чынам, сярод назоўнікаў мужчынскага роду роднага склону пераважаюць формы з канчаткам *-оў, -ёў*, незалежна ад месца націску ў словах. У № 52 у параўнанні з № 1 павялічваецца колькасць фіксацый нулявога канчатка, а таксама канчаткаў *-аў, -ёў* у ненаціскным становішчы.

1. 2. Канчаткі **меснага** склону.

- Пры аснове на *цвёрды* зычны ў № 1 60% прыкладаў маюць канчатак *-ах*: *на Чыстых Прудах, на курсах , у Атэнах і г. д.* ; 40% – канчатак *-ох*: *у гарадох, па знахарох*. У № 52 суадносіны *-ах*: *-ох* – 50:50 (%): *у промыслах, у гарадох*.
- У словах з асновай на *г, к, х* у № 1 у 83% выпадкаў фіксуецца канчатак *-ах*: *аб налогах, у стасунках, аб пастухках* і інш. ; у 17% – канчатак *-ох*: *на лугох*. У № 52 гэтыя суадносіны выглядаюць як 75:25 (%): *варунках, па засценках, у глухіх кутках*.
- У № 1 назоўнікі з асновай на *мяккі* зычны фіксуюць у 100% канчатак *-ях*: *у вуллях, у абычаях*; у № 52 заўважана адно слова з канчаткам *-ёх*, якое можна палічыць тут за 100%: *у краёх*.

У дадзенай пазіцыі адзначаецца наступная заканамернасць: пад націскам пераважна пісаўся канчатак *-ох (-ёх)*, а не пад націскам – канчатак *-ах (-ях)*.

2. Назоўнікі ***жаночага роду***.

2. 1. Канчаткі **роднага** склону.



- Пры аналізе № 1 «Нашай Нівы» зафіксаваны 91% слоў з асновай на *цвёрды* з нулявым канчаткам: *перамен, губ, пчол, калод, шчэлін, кароў, вучэніц*; 9% – з канчаткам *-аў*: *камэтаў*. У № 52 заўважана 85% слоў з асновай на *цвёрды* зычны з нулявым канчаткам: *сіл, афяр, страт, спраў, кос, душ, хвароб, лічб, пчол, варон, газэт, манэт, дзеўчат*; 10% слоў з канчаткам *-оў*: *травоў, прыправоў*; 5% з канчаткам *-аў*: *межаў*.
- У назоўніках з асновай на *мяккі* зычны ў № 1 назіраецца 100%-нае адлюстраванне канчатка *-ей*: *маетнасцей, цэрквей*, а ў № 52 100% складаюць прыклады з канчаткам *-ёў*: *рысёў, чытальнёў*.
- Пры аснове на *зацвярдзелы* ў абодвух нумарах пісаўся нулявы канчатак: *тысяч* (№ 1); *афяр, душ* (№ 52).
- Нулявы канчатак пераважае і ў словах з асновай на *г, к, х* – 100% і ў № 1 і ў № 52: *сьценак, лапак, авечэк* (№ 1); *казак, аптэк, красак, работак, птушэк, бібліотэк, капеек, кніг, батлеек, курсістак* (№ 52).

У разглядаемай пазіцыі пераважна ўжываўся нулявы канчатак, але характэрна, што ў пазнейшым з нумароў назіраецца пашырэнне выкарыстання канчаткаў *-оў (-ёў)*, прычым дадзены канчатак выкарыстоўваўся незалежна ад месца націску ў словах.

2. 2. Канчаткі **меснага** склону.

- У назоўніках з асновай на *цвёрды* ў абодвух нумарах – 100%-нае напісанне канчатка *-ах*: *аб патрэбах, аб рэформах, у войнах, на горах, аб пчолах* (№ 1); *па трубах, па струнах* (№ 52).
- У № 1 у словах з *мяккай* асновай раўнамерна – 50:50 (%) – прадстаўлены канчаткі *-ях* і *-ёх*: *у грудзёх, па валасьцях*; а ў № 52 сустракаецца толькі канчатак *-ях*: *у губэрнях*.
- У назоўніках з *зацвярдзелай* асновай у № 1 фіксуюцца канчаткі *-ах, -ох* у суадносінах 70:30 (%): *у хмарах, на гарах*, але ў *хмарох* і пад. У № 52 назоўнікаў жаночага роду меснага склону з асновай на зацвярдзелы не знайшлося.
- І ў № 1 і ў № 52 у назоўніках з асновай на *г, к, х* фіксуецца канчатак *-ах* у 100% выпадкаў: *па знахарках, у руках, у недавярках* (№ 1); *па вёсках , па чутках, у казках, аб бібліотэках* (№ 52) і г. д.
- У № 1 зафіксавана адно слова з асновай на *-j*, яно мае канчатак *-ях*: *у сем'ях*; у № 52 такіх прыкладаў няма.

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў назоўнікаў жаночага роду меснага склону пераважна ўжываўся канчатак *-ах (-ях)*. У № 1 ён яшчэ дзеліць сферу ўплыву з канчаткам *-ох (-ёх)*, які складае 50% з усіх фіксацый слоў у разглядаемай граматычнай форме, а ў № 52 увогуле не сустракаецца іншага варыянту канчатка.

3. Назоўнікі ***ніякага роду***.

3.1. Канчаткі **роднага** склону.

- У № 1 – назоўнікі з асновай на *цвёрды* і *зацвярдзелы* зычны ў 100% выпадкаў маюць нулявы канчатак: *цел, лекарств, дрэў, земств, таварыств, калёс*.
- Пры аснове на *г, к, х* зафіксаваны канчатак *-эй*: *вачэй*.
- Сярод слоў з асновай на *мяккі* 50% складае 1 слова з канчаткам *-ёў*: *палёў* і 50% – слова з канчаткам *-еў*: *заседаньнеў*.

У № 52 не зафіксавана ніводнага слова ў форме роднага склону множнага ліку. Адпаведна прасачыць храналагічную тэндэнцыю ў дадзенай пазіцыі немагчыма.

3.2. Канчаткі **меснага** склону.

Гэтая форма прадстаўлена ў № 1 «Нашай Нівы» адным словам з *цвёрдай* асновай – канчатак *-ох*: *аб правох*; двума словамі з асновай на *мяккі* – канчатак *-ях*: *на сабранях* , *на аржаньнях*; адным словам з асновай на *г, к, х* – канчатак *-ах*: *на вачах*.

У № 52 у форме меснага склону множнага ліку ўжыта толькі адно слова, якое мае канчатак *-ах* пасля *цвёрдага* зычнага: *мейсцах*.

У цэлым у адносінах да канчаткаў назоўнікаў ніякага роду складана гаварыць пра якую-небудзь тэндэнцыю.

Як паказаў аналіз, у «Нашай Ніве» пры наяўнасці прыкметнай варыянтнасці склонавых канчаткаў у большасці пазіцый тым не менш вылучаецца пераважаючы спосаб граматычнага афармлення склонаў. У асобных выпадках можна канстатаваць і наяўнасць пэўных граматычных тэндэнцый. Даследванне на шырэйшым храналагічным полі, безумоўна, дасць больш паказальныя вынікі, што можа паспрыяць вырашэнню сённяшніх спрэчных пытанняў адносна напісання склонавых канчаткаў.

*В. В. Вайтовіч (Нясвіж)*

## СУФІКСАЛЬНАЕ ЎТВАРЭННЕ НАЗОЎНІКАЎ І ПРЫМЕТНІКАЎ У СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ КАНЦЫЛЯРСКА-СПРАВАВОДЧАЙ ЛЕКСІКІ)

Сярод розных спосабаў папаўнення слоўнікавага складу старабеларускай мовы адным з самых эфектыўных і пашыраных з'яўлялася словаўтварэнне, г. зн. утварэнне новых слоў на базе ўжо існуючых у мове словаўтваральных сродкаў. У старабеларускай мове суфіксальнае словаўтварэнне характарызавалася найбольшай разнастайнасцю і прадуктыўнасцю. Гэта тлумачыцца як шырокім наборам (у параўнанні з прэфіксамі) словаўтваральных суфіксаў і іх варыянтаў, так і тым, што з дапамогай суфіксаў актыўна ўтвараліся новыя словы ўсіх часцін мовы, і ўтваральнымі асновамі для іх служылі розныя часціны мовы.

Найбольшай колькасцю сярод суфіксальнаўтвораных адзінак канцылярска-справаводчай лексікі старабеларускай мовы прадстаўлены назоўнікі і прыметнікі.

Асабліва прадуктыўным было ўтварэнне назоўнікаў з адцягненым значэннем ад пераходных дзеясловаў незакончанага трывання. Часта словаўтваральным сродкам выступаў суфікс *-нь- (е)*: *актыкованье (актикованье, актиковане), вписанье (уписанье), вписованье, выписыванье, дописване, записанье, записованье, записыванье, квитованье, нотованье, подписанье, подписованье, списованье* і інш. Аналагічныя назоўнікі ўтвараліся і пры дапамозе



суфікса *-ень- (е)*. Напрыклад, субстантыў *клеенье* ўжываўся са значэннем 'дзеянне па дзеяслову *клеить*': *папиру до протоколу купили либру доброе асм. осмнадцать; чорное на клеенье папиру либру асм. пять* (ИЮМ, I, 22, 1679). З дапамогай суфікса *-ень- (е)* утварыліся назоўнікі: *замкненье, занесенье, преложенье, утерженье (утерженіе, утержене, утверждеціе)* і інш. Аддзеяслоўныя назоўнікі з асновай на *-н-* у пісьмовых помніках перадаваліся па-рознаму: на *-ние, -нье, -не* і *-нне*. Некаторыя субстантывы мелі характэрнае для старабеларускай мовы падаўжэнне зычнага: *актиковане, дописване, утержене*.

Выклікаюць цікавасць аднакарэнныя пары дзеяслоў – назоўнік, якія абазначаюць адпаведна 'дзеянне' – 'адцягненае дзеянне'. Напрыклад, па дадзеных «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы», дзеяслоў *актыковати (актиковать, актыковать)* меў значэнне 'уносіць дакумент у актавую кнігу' (I, 93), назоўнік *актыкацыя (актикация)* ужываўся са значэннем 'занясенне дакумента ў актавую кнігу' (I, 92). М. С. Васілеўскі лічыць, што члены падобных пар знаходзяцца ў становішчы ўзаемнай матывацыі, таму цяжка вызначыць, што тут першаснае [3, с. 31]. А. М. Булыка вытворнымі лічыць назоўнікі [2, с. 238]. Мы далучаемся да меркавання, што вытворнай асновай з'яўляецца тая, якая выражае не характэрнае для пэўнай часціны мовы значэнне, да якой адносіцца дадзенае слова (СРЯ 1989, 303). Таму вытворнымі ў падобных парах з'яўляюцца назоўнікі.

Шмат назоўнікаў канцылярска-справаводчай лексікі было ўтворана пры дапамозе суфіксаў з элементам **-к-**. Як лічыць П. Вярхоў, «сучасны элемент *-к-*, што ўваходзіць да складу суфіксаў славянскіх моў, унаследаваны ад індаеўрапейскай эпохі. Ён з'яўляецца вынікам даўняга самастойнага суфікса *ko, які служыў у славянскіх мовах, таксама і ў індаеўрапейскіх, у якасці пашыральніка першасных асноў» [5, с. 12].

Суфіксы з элементам **-к-** з'яўляліся мадыфікацыйнымі афіксамі, якія відазмянялі (мадыфікавалі) семантыку ўтваральнага слова. Як паказвае кантэкст, вытворныя лексемы з суфіксам *-к-* былі пазбаўлены якога-небудзь суб'ектыўна-эмацыянальнага значэння і служылі найменнямі прадметаў, аб'ектыўна малых па памерах. Напрыклад, *калита (калета, колита) – калитка (колитка): зъгинула мъне на тот час колита, у которой згинулъ листъ на мещанина витебского Апонаса Иевлева* (ИЮМ, XXXII, 181, 1578); *калитку у пана Озаринского купили гафтованую, дали золот. девять* (ИЮМ, I, 247, 1682); *папера – паперка: въ писанью листовъ на папере перомъ формы не маемъ* (АВК, VIII, 445, 1588); *грошей не ведаю колко, въ паперце далъ ми отезъде* (ИЮМ, IX, 304, 1637); *цедула (цадула, цидула, цыдыла, цэдула), цедулка: Тую цедулу е. м Вилнньскій при листе своемъ прислалъ* (АЗР, III, 238, 1578); *есть ли бы мелъ он на то него іаки квиточокъ або цедулку* (ГЮМ, XXXII, 35, 1578).

Суфікс *-окъ-* выконваў таксама функцыю памяншальнасці. З дапамогай яго ўтвараліся як асабовыя, так і неасабовыя назоўнікі. Па дадзеных ГСБМ (IX, 131) лексема *дьякъ (дьакъ, дякъ)*